# У Дубічах–Царкоўных

У гміне Дубічы–Царкоўныя штогод памірае каля ста чалавек, а нараджаецца толькі каля дзесяці. 2700 жыхароў гміны жывуць галоўным чынам з рознага тыпу пэнсіяў. Выратаваньне гміны ад павольнага кананьня стала асноўнай тэмай выбарчай кампаніі, якая ў Дубічах–Царкоўных і навакольных вёсках мела вельмі актыўны характар.

Хаця ўсе кандыдаты выступалі як незалежныя і толькі адзін падкрэсьліваў сваю партыйную прыналежнасьць (Пятро Багроўскі з БДА), вядома было паўсюдна, што ствараюцца два нефармальныя блёкі з двума лідэрамі: Сяргеем Нічыпаруком з Грабаўца і Юр’ем Несьцеруком з Дубічаў. Абодва яны ішлі калісьці рука ў руку, змагаліся за перамены ў гміне, але цяпер іх шляхі разышліся. Выбарчае змаганьне працягнулася і пасьля выбараў, цяпер ужо за галасы новаабраных радных, да апошняга вечару перад першым паседжаньнем Рады. Астаткі выбарчай кампаніі разыграліся на вачах радных падчас паседжаньня. Дзьве асобы з публікі, якія былі контракандыдатамі Ю. Несьцерука ў выбарах на раднага, выступілі зь нейкімі дакорамі на ягоны адрас. На мой погляд, радныя не павінны былі дапусьціць да таго, каб на паседжаньні зводзіліся асабістыя разьлікі.

Падчас стаўленьня кандыдатаў на пост старшыні Рады нефармальная Кааліцыя за ратаваньне і разьвіццё гміны, якая быццам бы падтрымоўвала Ю. Несьцерука, трэснула на вачах. Усплыла яшчэ адна кандыдатура — Мікалая Лаўрыновіча са Старога Корніна. Такім чынам, выбары выйграў С. Нічыпарук, якому дзеля гэтага хапіла сямі галасоў зь пятнаццаці.

С. Нічыпарук, вядомы грамадзкі дзеяч (у свой час зьвязаны зь сялянскай “Салідарнасьцю»), цяпер зьяўляецца прадпрымальнікам. Ён пасьпяхова разьвівае прадукцыю дамоў канадзкага тыпу і займаецца турыстыкай. Якраз свой асабісты прадпрымальніцкі посьпех ён ставіў у сваім праграмным выступленьні як прыклад магчымасьцяў выратаваньня гміны. Перад раднымі разьвёў ён прывабны вобраз разьвіцьця прадуктовай экалягічнай вытворчасьці і разьвіцьця супрацоўніцтва зь беларускімі прадпрыемствамі, для якіх гміна магла б стаць базай для супрацоўніцтва з Польшчай і заходнімі краінамі. Кінуў ён таксама думку аб стварэньні ў Дубіцкай гміне цэнтру інтэграцыі беларускай дыяспары.

Гмінная рада ў Дубічах-Царкоўных прэзэнтуецца вельмі добра. Уражвае маладосьць многіх радных. Ствараецца ўражаньне, што жыхары сапраўды выбралі гэтую Раду ў нейкім рэфлексе самавыратаваньня. Тым ня менш, гмінная палітыка кіруецца сваімі законамі, а ў гміне Дубічы–Царкоўныя яны вельмі суровыя. Спрадвеку жыхары гэтай падпушчанскай ваколіцы славяцца сваёй нецярпімасьцю. Помніцца хаця б вэрхал, які падняўся на ўсю Беласточчыну ў сувязі з узьнікненьнем у Дубічах “Салідарнасьці”, ды сьведчаць фундамэнты спаленага дому колішняга гміннага начальніка і абгарэлыя сьцены дому Ю. Несьцерука.

Цяпер страсьці быццам аціхлі, але шлях да выратаваньня гміны так ці інакш доўгі і цярністы.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1994. 17 ліпеня. № 29. С. 3.